# Свята "Берагіні"

**З 21 па 24 чэрвеня у гарадскім пасёлку Акцыябрскі Гомельскай вобласці прайшоў VII Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня". Унікальны і самабытны форум сабраў сёлета шматлікіх удзельнікаў, а гэта звыш 800 чалавек — як з Беларусі, так і з Украіны ды Расіі.**



У фестывалі прынялі ўдзел дзіцячыя фальклорныя калектывы, аўтэнтычныя гурты, ансамблі народнай музыкі, пары-выканаўцы народнага побытавага танца, якія вывучаюць, пераймаюць і папулярызуюць аўтэнтыку свайго краю.

Вынікі форуму агучылі напрыканцы фестывалю. Дыпломамі лаўрэата І ступені і каштоўнымі падарункамі былі ўзнагароджаны фальклорны ансамбль "Талака" (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск), фальклорны калектыў "Верас" (Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, Мінск), узорны фальклорны ансамбль "Рудабельскія зорачкі" з Акцыябрскага, фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Свеці Цвет" Дома дзіцячай творчасці Ніжагародскага раёна (Расія), народны ансамбль "Очелье" Пскоўскага абласнога каледжа мастацтваў імя М.А. Рымскага-Корсакава (Расія), беларускі фальклорны ансамбль "Кірмаш" з Масквы і народны фальклорны ансамбль імя П.Бакланава "Жива вода" факультэта філалогіі і журналістыкі Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя У.Г. Караленкі (Украіна).



Дыпломамі лаўрэата "За захаванне і папулярызацыю культурнай спадчыны сваёй Бацькаўшчыны" ды каштоўнымі падарункамі адзначылі народны фальклорны гурт "Хацілаўляне" Хацілаўскага сельскага дома культуры Маларыцкага раёна, народны тэатр фальклору "Цярэшка" Глыбоцкага раённага метадычнага цэнтра, фальклорна-этнаграфічны калектыў Залатушскага сельскага дома культуры Калінкавіцкага раёна, аўтэнтычны гурт "Перазвоны" Цэнтра культурна-дасугавай дзейнасці Акцыябрскага раёна, аўтэнтычны гурт "Купалінка" Пратасаўскага сельскага дома народнай творчасці Акцыябрскага раёна, народны фальклорны калектыў "Палескія крыніцы" вёскі Рог Салігорскага раёна.

У XI Рэспубліканскім конкурсе танцавальных пар выканаўцаў народных побытавых танцаў дыпломамі лаўрэата І ступені і каштоўнымі падарункамі былі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу і кіраўнікі, якія іх падрыхтавалі. Сярод 5 — 6 класаў — Ягор Ахраменка і Ірына Бабаед з фальклорнага калектыву "Праменьчыкі" ДШМ г. п. Акцыябрскі і кіраўнік Ірына Семілет. У катэгорыі 7 — 8 класаў перамогу святкавалі Станіслаў Караленка і Ангеліна Калбасава з Рагачоўскай дзіцячай школы мастацтваў Полацкага раёна Віцебскай вобласці ды кіраўнік Наталля Сідарэнка. А сярод 9 — 11 класаў уганараваны Уладзімір Ярмоленка і Ульяна Кругаль (узорны фальклорны ансамбль "Рудабельскія зорачкі") ды згаданы ўжо кіраўнік Ірына Семілет.

**Фота Наталлі ЕВЕНКА**



